*УДК 908*

# СТВАРЭННЕ КРАЯЗНАЎЧАГА ІНТЭРНЭТ-ПРАЕКТА «МАЛАДЗЕЧАНСКІ КРАЙ У ПРАСТОРЫ І ЧАСЕ» З ВЫКАРЫСТАННЕМ ІНТЭРНЭТ-РЭСУРСАЎ


**Мяцельскі Ю.М, Фалей П.А.**

*Дзяржаўная установа адукацыі “Палачанская сярэдняя школа Маладзечанскага раёна”*
*аг. Палачаны, Маладзечанскі раён, Мінская вобласць, Рэспубліка Беларусь, yurametelskiy@mail.ru*



Стварэнне краязнаўчага web-сайта накіравана на папулярызацыю прыроднай і культурнай спадчыны Маладзечанскага раёна і зыходзіць з рэалізацыі праекта ЕС/ПРААН "Садзейнічанне развіццю на мясцовым узроўні ў Рэспубліцы Беларусь". Асаблівасцю дадзенага праекта з'яўляецца сістэматызацыя асобных прыродных, гісторыка-культурных, сацыяльна-геаграфічных аб'ектаў на падставе вуснагістарычных даследаванняў, праведзеных падчас экскурсій і паходаў па малой радзіме. Краязнаўчы web-сайт будзе запатрабаваны як жыхарамі раёна, так і нашымі гасцямі, а таксама людзьмі з абмежаванымі фізічнымі магчымасцямі.



*Ключавыя словы*: Малая радзіма; краязнаўства; зялёныя маршруты; турызм.


# CREATING A LOCAL HISTORY WEB-PROJECT «MOLODECHNO REGION IN SPACE AND TIME” USING THE INTERNET RESOURCES


**Miatselski Yu.M., Falei P.A.**

*State Educational Establishment «Polochanskaya Secondary School of Molodechno District»*
*agrotown Polochany, Molodechno District, Minsk Region, Republic of Belarus, yurametelskiy@mail.ru*



The creation of a local history web-site is aimed at promoting the natural and cultural heritage of Molodechno region and proceeds from the implementation of the EU / UNDP project “Promoting local development in Belarus”. One special feature of this project is systematization of separate natural, historical and cultural, social and geographical objects on the basis of oral historical researches conducted during the excursions and hikes around the Native Land. The local history web-site will be in demand both by the residents of the region and our guests, as well as by people with disabilities



*Key words:* Native Land; local history; green routes; tourism.


Маладзечанскі раён валодае унікальным прыродным і гісторыка-культурным патэнцыялам: мікразаказнікамі і помнікамі прыроды мясцовага значэння, сакральнымі святымі месцамі, геалагічнымі і археалагічнымі помнікамі, музеямі, праваслаўнымі і каталіцкімі святынямі, народнымі ансамблямі, традыцыямі і абрадамі, знакамітымі людзьмі і г.д. Хацелася б, каб пра нашу малую радзіму даведалася як мага больш людзей.

Актуальнасць тэмы даследавання абумоўлена неабходнасцю стварэння ўмоў для папулярызацыі прыроднай і гісторыка-культурнай спадчыны Маладзечанскага раёна, што зыходзіць з рэалізацыі праекта ЕС/ПРААН "Садзейнічанне развіццю на мясцовым узроўні ў Рэспубліцы Беларусь" і прымеркавана да Году малой радзімы.

Аб’ектам даследавання выступае прыроднае і сацыяльнае асяроддзе Маладзечанскага раёна. Прадметам даследавання з’яўляецца web-сайт, як сродак захавання і папулярызацыі краязнаўчай інфармацыі.

Мэта даследавання: стварэнне краязнаўчага інтэрнэт-праекта “Маладзечанскі край у прасторы і часе” з выкарыстаннем магчымасцей інфармацыйных тэхналогій для павышэння цікавасці да прыроднай, гістарычнай і культурнай спадчыны малой радзімы.

Задачы:

- прааналізаваць літаратурныя крыніцы па тэме даследавання, вывучыць праблему і вызначыць метады даследавання;
- выявіць фактары і элементы, якія аказалі ўплыў на змяненне геаграфічнай і сацыяльна-культурнай структуры Маладзечанскага раёна;

- паказаць магчымасць стварэння інтэрнэт-праекта з выкарыстаннем мабільных дадаткаў iSpring, izi.Nravel, графічнага рэдактара Pano2VR5 і Google Карты;

- распрацаваць аптымальную структуру канструктара web-сайта для размяшчэння прадукта даследавання ў сетцы Інтэрнет.

Адметнасцю нашага даследавання з’яўляецца тая акалічнасць, што мы стварылі картаграфічную генералізацыю асобных прыродных, гістарычных, архітэктурных, сацыяльна-геаграфічных аб’ектаў на аснове бібліяграфічнага аналізу, вуснагістарычных даследаванняў і ГІС-тэхналогій.

Першым крокам выканання работы быў збор інфармацыі пра аб’екты раёна, якія валодаюць турысцкім патэнцыялам і ўяўляюць цікавасць як для жыхароў раёна, так і для нашых гасцей. Затым была праведзена групоўка гэтых аб’ектаў па відах турызму (музейны турызм, паломніцкі турызм, агратурызм, экалагічны турызм і г.д.), распрацаваны турысцкія маршруты з кароткім апісаннем экскурійных аб’ектаў і складзены адпаведныя картасхемы.

На тэрыторыі Маладзечанскага раёна налічваецца звыш 200 помнікаў і ваенных пахаванняў – галоўным чынам сведкаў Першай сусветнай і Вялікай Айчыннай вайны, дзейнічае 16 музеяў і філіялаў, раённы цэнтр рамёстваў. У райне зарэгістравана 50 рэлігійных абшчын: 27 праваслаўных, 10 каталіцкіх, 7 хрысціян веры евангельскай, 2 евангельскіх хрысціян-баптыстаў, 1 адвентыстаў сёмага дня, 1 грэка-каталіцкая, 1 іудзейская, 1 мусульманская. Многія з іх з’яўляюцца помнікамі архітэктуры (гл. малюнак 1). Да аб’ектаў экалагічнага турызму адносяцца маляўнічыя прыродныя мясціны, заказнікі, пейзажныя паркі і помнікі прыроды мясцовага значэння. На тэрыторыі Маладзечаншчыны зарэгістравана 26 аграсядзіб, якія карыстаюцца вялікім попытам у наведнікаў.



Мал. 1. Груздаўская царква Рызапалажэння Прасвятой Багародзіцы – помнік архітэктуры беларускага драўлянага дойлідства

Сайт змяшчае наступныя старонкі:

- галоўная старонка, на якой расказваецца пра наш праект;

- старонка “Карта” змяшчае ўсе створаныя намі карты ў праграмным комплексе “Quantum.GIS” і сэрвісе Google карты; на гэтую старонку мы змясцілі аўдыёгід па маршруце краязнаўчай экскурсіі “Сцежкамі славутых землякоў”, створаны ў мабільным дадатку izi.Travel, а таксама кругвыя панарамы найбольш яскравых экскурсійных эб’ектаў;

- старонка “Віртуальныя экскурсіі” правядзе наведнікаў сайта маршрутамі распрацаваных намі экскурсій у віртуальным рэжыме, пазнаёміць з найбольш адметнымі населенымі пунктамі Маладзечаншчыны; для гэтага неабходна з дапамогай Adobe Flash Player адкрыць прэзентацыю “Маладзечанскі край у прасторы і часе” і дзейнічаць згодна інструкцыі; на гэтай жа старонцы можна пагуляць у інтэлектуальную гульню “Кола фартуны” – “Ці ведаеце вы Маладзечанскі край?”;

- старонка “Краязнаўчая скарбонка” змяшчае такія раздзелы, як “Прыродная спадчына”, “Помнікі гісторыі і культуры”, “Страчаная архітэктурная спадчына”, “Тапаніміка”, “Легенды і паданні”;

- старонка “Відэа” змяшчае відэаматэрыялы краязнаўчай тэматыкі, якія стварылі юныя краязнаўцы нашай школы.




1. Гідралагічны заказнік «Рака Вязынка»
2. Ландшафтны заказнік «Бортнікі»
3. Заказнік «Верадова»
4. Біялагічны заказнік «Сасна Веймутава»
5. Помнік прыроды «Максімава крыніца»
6. Помнік прыроды «Крыніца Лешна»
7. Батанічны помнік прыроды «Лістоўніца еўрапейская»
8. Парк прыроды «Маліноўшчына»
9. Парк прыроды «Беразінскае»
10. Парк прыроды «Яхімоўшчына»

Геалагічныя помнікі прыроды

11. Шведская гара
12. Гара Капланшчына
13. Гара Курган
14. Гара Маяк
15. Слабодкаўская выдма

Расліны Чырвонай Кнігі Беларусі

16. Шпажнік чарапітчаты
17. Лілея кучараватая
18. Баранец звычайны
19. Пылкагалоўнік даўгалісты
20. Пярэсна горная
21. Сон-трава

Мал. 2. Зялёныя маршруты Маладзечаншчыны

З верасня па снежань 2018 года каманда “Polochany-City”, у склад якой уваходзіла 7 вучняў 11 класа Палачанскай сярэдняй школы прымала ўдзел у міжнародным сеткавым праекце “Мая малая радзіма”, які праводзіўся пры падтрымцы ўпраўлення выхаваўчай работай з моладдзю Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Янкі Купалы. На працягу трох месяцаў удзельнікі каманды шукалі адказы на пытанні “Якая яна, мая малая радзіма?” і “Чым я магу дапамагчы сваёй малой радзіме?” У рамках конкурсу рабяты спасцігалі прыгажосць і самабытнасць сваёй малой радзімы, убачылі яе славутасці, выдзелілі праблемы, прапанавалі свой удзел у іх вырашэнні. Юныя краязнаўцы змаглі ацаніць прывабныя бакі сеткавых праектаў, магчымасці камп’ютарных тэхналогій і інтэрнэт-сэрвісаў для рашэння даследчых задач. 21 снежня ў сценах ГрДУ імя Я. Купалы адбылася публічная прэзентацыя праектаў 15-ці каманд-фіналістаў. Сеткавы праект

палачанцаў (дарэчы, адзіная каманда, якая прадстаўляла на конкурсе Мінскую вобласць) не меў аналагаў сярод праектаў іншых каманд, а каманда "Polochany-City" кампетэнтнасным журы конкурсу была прызнана абсалютным пераможцам і ўзнагароджана Дыпломам I ступені і памятным падарункам. Дадзены праект размешчаны на старонцы "Мая малая радзіма" нашага краязнаўчага сайта.

Створаны намі электронны краязнаўчы рэсурс будзе даступны шырокаму колу людзей, у тым ліку і людзям з абмежаванымі магчымасцямі здароўя, якія не ў стане здзейсніць рэальнае падарожжа па славутай маладзечанскай зямлі. Наш праект дазволіць прасякнуцца гонарам за багацейшую спадчыну, якая дасталася нам ад нашых продкаў і выпрабаваць пачуцці адказнасці за месца, дзе мы нарадзіліся і жывём. Кожны чалавек, які не абыякавы да мінулага і сучаснасці роднага краю, зможа азнаёміцца з асаблівасцямі прыроды, гісторыі і культуры Маладзечанскага раёна і, пры жаданні, выбраць маршрут і паўтарыць яго самастойна. У гэтым заключаецца практычная каштоўнасць нашага інтэрнэт-праекта. Web-сайт, які мы стварылі, можа быць выкарыстаны на ўроках геаграфіі, гісторыі, факультатыўных і дадатковых занятках краязнаўчай накіраванасці, а таксама можа быць запатрабаваны турыстамі-аматарамі і турысцкімі арганізацыямі раёна.

Унікальнасць нашага web-сайта ў тым, што ён можа пастаянна абнаўляцца, папаўняцца новымі звесткамі пра нашу малую радзіму і працягваць работу над ім змогуць будучыя пакаленні навучэнцаў.

**Бібліяграфічныя спасылкі**


1. Ермаловіч, М. Беларуская дзяржава Вялікае княства Літоўскае / М. Ермаловіч. – Мінск : Беллітфонд, 2000. С. 448.
2. Казлоўскі, М.М. Цяпло айчынных камянёў / М. М. Казлоўскі. – Мінск: Мастацкая літаратура, 2014. С. 126.
3. Каханоўскі, Г. А. Повязь часоў / Г. А. Каханоўскі. – Мінск: Полымя, 1985. С. 144.
4. Маладзечанскі раён: ілюстрацыйнае выданне / укладальнік М. М. Казлоўскі. – Мінск: Беларусь, 2015. С. 245.
5. Маладзечанская газета // выданні перыядычнага друку.
6. Памяць: Гісторыка-дакументальная хроніка Маладзечна і Маладзечанскага раёна / Рэд. калегія: Г.П. Пашкоў [і інш.]. – Мінск: БелЭн, 2002. С. 792.
7. Рэгіянальная газета // выданні перыядычнага друку.
8. Хазянін, А. А. Сярод добрых людзей / А. А. Хазянін. – Мінск: Мастацкая літаратура, 2012. С. 122.